# Наведвальнікі бібліятэкі

Дзяржаўную бібліятэку імя Леніна наведала 650 чытачоў. За дзень было выдана 1.500 кніг.

Каля трэцяй часткі чытачоў патрабавалі кнігі і падручнікі па грамадска-палітычнай і соцыяльна-эканамічнай тэматыцы. Вялікі попыт быў на творы В. І. Леніна і І. В. Сталіна, на біяграфіі правадыроў.

У прасторнай чытальнай зале навуковай літаратуры працавалі навуковыя работнікі і аспіранты тт. Салагуб, Цітовіч, Фрыдман, Розенгауз, Захараў, Філіпенка, Бутрымовіч. Тут пабывала 30 чалавек, якія атрымалі 185 кніг.

460 студэнтаў БДУ, політэхнічнага і юрыдычнага інстытутаў і іншых навучальных устаноў сталіцы рыхтаваліся ў бібліятэцы да здачы экзаменаў. Яны атрымалі падручнікі і літаратуру па ўсіх цікавячых іх пытаннях.

Увагу чытачоў прыцягвае выстаўка, арганізаваная да пяцігоддзя з дня смерці народнага паэта БССР Янкі Купалы. У вітрыне прадстаўлены творы паэта дарэвалюцыйнага і совецкага часу, перыяда Айчыннай вайны. Асаблівую цікавасць выклікае кніга «Шляхам жыцця», выданая ў 1913 годзе ў Пецярбургу з асабістымі паметкамі і карэктурай аўтара.

Дзесяткі людзей наведалі 27 чэрвеня беларускі аддзел.

Многа наведвальнікаў і ў аддзеле даведак. Афіцэр Совецкай Арміі хоча даведацца, чаму марскі флаг называецца андрэеўскім, навуковы работнік просіць парэкамендаваць літаратуру па пытаннях паходжання свету. З Палаца піянераў цікавіліся літаратурай аб пастаноўцы піонерскай работы ў лагерах і аб арганізацыі аднадзённай дзіцячай экскурсіі.

Міжбібліятэчны абанемент бібліятэкі абслугоўвае ўсе куткі нашай рэспублікі. Сюды за спецыяльнай і палітычнай літаратурай звяртаюцца ўрачы, аграномы, настаўнікі, партыйныя і совецкія работнікі. Сёння па просьбе чытачоў накіравана на перыферыю—у Віцебск, Магілеў, Оршу і іншыя абласныя і раённыя цэнтры рэспублікі 20 пасылак з навукова-тэхнічнай літаратурай і рознымі часопісамі.

Цесную сувязь з бібліятэкай трымаюць буйныя прадпрыемствы. Сёння трактарны завод атрымаў тут 30 кніг па рознастайных тэхнічных пытаннях, бібліятэка радыёзавода — 7 кніг.